# НОВЫЯ МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ КАСТРЫЧНІЦКІХ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПАДЗЕЙ 1917 Г.

Мікалаева Л.В., кандыдат гістарычных навук,
УА “БДУІР”, г. Мінск

Гісторыкі-прафесіяналы добра разумеюць значэнне метадалогіі для ажыццяўлення даследавання. Метадалогія гісторыі з’яўляецца своеасаблівым механізмам навуковага пазнання [7, с. 11]. Агульнавядома таксама, што перад метадалогіяй стаіць і задача па ўдасканаленні паняційнага апарата. Ад ступені яго распрацаванасці і дыферэнцыраванасці залежыць узровень развіцця навукі. Разам з тым, у працэсе ўдакладнення паняццяў адны з іх адміралі і ім на змену прыходзілі новыя, другія змянялі свой сэнс, трэція пашыралі свой змест [7, с. 7]. Да ліку апошніх належыць і паняцце “рэвалюцыя”.

Для пачатку паспрабуем вызначыцца з азначэннем гэтай дэфініцыі. Па звестках тлумачальнага слоўніка С.І. Ажэгава, рэвалюцыя – гэта “1. Коренной переворот в обществе, который приводит к ликвидации общественного и политического строя и передает власть в руки передового класса. 2. Коренной переворот, резкий скачкообразный переход от одного качественного состояния к другому” [3, с. 585]. У сучаснай паліталогіі рэвалюцыя (ад лац. revolutio) – гэта “глубокое и качественное изменение в развитии общества, в способе производства, в различных областях знаний”. Пры гэтым сцвярджаецца, што рэвалюцыі ўзнікаюць у выніку паступовага нарастання супярэчнасцей, што накапліваюцца ў працэсе эвалюцыйнага развіцця, якія вырашаюцца пераваротам, скачком, рэзкімі зменамі [4, с. 338]. Такім чынам, рэвалюцыі з’яўляюцца вынікам аб’ектыўнага заканамернага працэса і ўзнікаюць на пераломным этапе, калі склаўшыяся супярэчнасці ці канфлікты не могуць быць вырашаны ніякім іншым спосабам. Яны гістарычна непазбежныя.

Вялікі ўклад у распрацоўку тэорыі рэвалюцыі ўнеслі тэарэтыкі-марксісты. Яны шырока выкарыстоўвалі паняцце “сацыяльная рэвалюцыя” для характарыстыкі грамадскага

развіцця. Класічная яго фармулёўка прыведзена ў “Большой Советской Энциклопедии”, артыкул у якой сцвярджае, што сацыяльная рэвалюцыя – гэта “способ перехода от исторически изжившей себя общественно-экономической формации к более прогрессивной, коренной качественный переворот во всей социально-экономической структуре общества. …Революция никогда не является плодом заговора одиночек или произвольных действий изолированного от масс меньшинства. Она может возникнуть только в результате объективных перемен, приводящих в движение массовые силы и создающих революционную ситуацию”. Аб’ектыўныя асновы сацыяльнай рэвалюцыі карэняцца ў способе вытворчасці. Пры гэтым адзначаецца, што рэвалюцыя непазбежна сустракае на сваім шляху перашкоду ў выглядзе палітычнай улады пануючага класа. Таму “первым актом социальной революции является революция политическая, т.е. завоевание государственной власти революционным классом” [2, с. 545]. Такім чынам, сацыяльныя і палітычныя рэваюцыі ўзнікаюць як наступства нарастання супярэчнасцей ў грамадстве на пэўным этапе яго развіцця і прадстаўляюць сабой найбольш вострыя формы барацьбы паміж нараджаючыміся новымі і аджываючымі старымі формамі грамадскіх адносін.

Разам з тым, даследчыкамі вылучаюцца шэраг тыпаў сацыяльных і палітычных рэвалюцый: антыімперыялістычныя (нацыянальна-вызваленчыя, антыкаланіяльныя), буржуазныя, буржуазна-дэмакратычныя, народныя, народна-дэмакратычныя, сацыялістычныя. Сацыялістычная рэвалюцыя разглядалася савецкімі вучонымі як “гістарычна апошні тып палітычных рэвалюцый” [9, с. 235]. Прычым працяглы перыяд тэарэтыкі марксізму лічылі, што перамога сацыялістычнай рэвалюцыі магчымая толькі ў выніку гвалтоўнага пераварота (узброенага паўстання) ці грамадзянскай вайны. Толькі ў канцы 1950-х гг. яны прыйшлі да высновы пра магчымасць мірнай заваёвы ўлады працоўнымі, у т.л. і парламенцкім шляхам [4, с. 339].

У наш час навукоўцы працягваюць карыстацца напрацоўкамі тэарэтыкаў марксізму, сцвярджаючы, што сацыялістычная (пралетарская) рэвалюцыя – гэта “высший тип социальной революции, в ходе которой осуществляется переход

от капитализма к социализму и коммунизму. Такая революция должна ликвидировать частную собственность на средства производства, заменив ее общественнной, покончить с анархией в производстве, перевести его на плановую основу, утвердить власть рабочего класса – диктатуру пролетариата в той или иной форме, решить национальный вопрос, перестроить экономические отношения социальную структуру, нравственность, культуру общества и т.д.” [4, с. 339].

Звяртаючыся да падзей кастрычніка 1917 г. у Расійскай дзяржаве, у т.л. на тэрыторыі Беларусі, трэба адзначыць шырокую тэрміналагічную варыятыўнасць высначэнняў азначаных падзей. Адны гісторыкі па-ранейшаму лічаць іх Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй, паклаўшай пачатак навейшага перыяду ў гісторыі ўсяго чалавецтва. Другія сцвярджаюць, што, наадварот, гэта быў пераварот [1], бальшавіцкі загавар, проста ўзброенае паўстанне [5, с. 202] і г.д. Аднак сярод апошніх беларускіх энцыклапедычных выданняў устаяўся поглад на кастрычніцкія падзеі 1917 г. як на сацыяльную рэвалюцыю, у ходзе якой да ўлады прыйшла партыя бальшавікоў, што ўзяла курс на ліквідацыю капіталістычных адносін і пабудову сацыялізму [6, с. 552]. Пераважная большасць сучасных гісторыкаў ужывае для пазначэння сітуацыі восені 1917 г. назву “Кастрычніцкая рэвалюцыя”.

Да вывучэння рэвалюцыйных падзей 1917 г. гісторыкамі ўсё часцей пачынаюць прыцягвацца метадалагічныя напрацоўкі сенегетыкі – тэорыі і метадаў самаарганізацыі, што ператвараецца ў наш час у ядро сучаснай навуковай карціны свету. Супрацьпастаўленне фармацыйнага і цывілізацыйнага метадалагічных падыходаў да даследавання і вывучэння гісторыі падштурхоўвае навукоўцаў да сінегретычнай метадалагічнай мадэлі. Заходячы з яе пастулатаў, грамадства разглядаецца як унутрана збалансаваная сістэма, што абменьваецца энергіяй са знешнім светам, сістэма, у якой элемент выпадковасці мае двайную накіраванасць, знішчаючы старое і ствараючы новае [7, с. 33].

Пад уплывам пераносу парадыгмальных установак і прынцыпаў з іншых дысцыплін аб’ектамі сучасных гістарычных

даследаванняў усё часцей становяцца ўнікальныя сістэмы, што характарызуюцца адкрытасцю і самаразвіццём. Гэта – гістарычна развіваючыяся сістэмы, якія з’яўляюцца больш складаным тыпам аб’екта нават у параўнанні з самарэгулюючымися сістэмамі. Гістарычна равіваючаяся сістэма “формирует с течением времени все новые уровни своей организации, причем возникновение каждого нового уровня оказывает воздействие на ранее сформировавшиеся, меняя связи и композицию их элементов” [8, с. 183]. Фарміраванне кожнага такога ўзроўню суправаджаецца праходжаннем сістэмы праз станы няўстойлівасці (кропкі біфуркацыі), і ў гэтыя моманты нават невялікія выпадковыя ўздзеянні могуць прывесці да з’яўлення новых структур.

Улічваючы тыя абставіны, што чалавек з’яўляецца часткай такіх сістэм, любое яго дзеянне можа стать фактарам, здольным кожны раз відазмяняць поле магчымых станаў сістэмы. Уключаючыся ва ўзаемадзеянне, чалавек у пераломныя моманты сутыкаецца з праблемай выбара пэўнай лініі развіцця з мноства магчымых шляхоў эвалюцыі сістэмы. Прычым сам гэты выбар “необратим и не может быть однозначно прочитан” [8, с. 184].

Такім чынам, сінергетыка дэманструе працэс самаарганізацыі адкрытых нелінейных сістэм, якой таксама з’яўляецца грамадства, і паказвае дваістую прыроду хаоса. Хаос разбуральны, бо складаныя сістэмы могуць быць няўстойлівымі да самый малых уздзеянняў ці флуктуацый на мікраўзроўні. У той жа час ён канструктыўны, бо з’яўялецца механізмам узгаднення тэмпаў эвалюцыі, пры аб’яднанні простых сістэм у складаныя ці пры змяненні розных рэжымаў развіцця сістэмы.

Раней выпадковасць выдалялася з навуковай тэорыі, што выклікала да жыцця сцвярджэнне аб тым, што адзінкавае чалавечае намаганне не можа мець уздзеяння на ход гісторыі. Таму дзейнасць кожнага асобнага чалавека не разглядалася як істотная для макрасацыяльных працэсаў. Сінергетычная ж мадэль паказвае, што ў моманты няўстойлівасці нават самыя малыя ўздзеянні могуць разрастацца ў макраструктуры. У сілу

гэтага намаганні аднаго чалавека ў вызначаных станах няўстойлівасці сацыяльнага асяроддзя могуць аказваць уплыў на макрасацыяльныя працэсы, якія характарызуюцца прынцыповай незваротнасцю. Такі падыход патрабуе неабходнасці ўсведамлення кожным чалавекам вялікай адказнасці за лёс сваёй сацыяльнай сістэмы, за будучае ўсяго грамадства. Разам з тым, у рамках такога падыходу ўзвышаецаа роля асобы ў гісторыі. Прадстаўнікі сінергетычнай парадыгмы надзяляюць такой роллю любую нармальную асобу [7, с. 37].

Часы войн і рэвалюцый з'яўляюцца тыповымі прыкладамі кропак біфуркацыі. У перыяд рэвалюцыі адбываецца сутыкненне асоб, што прадстаўляюць розныя пласты грамадства. Тым самым пашыраюцца межы паняцця "сацыяльная рэвалюцыя": у ім з'яўляецца антрапалагічны складнік. У выніку само паняцце "сацыяльная рэвалюцыя" напаўняецца новым зместам [7, с. 8].

У межах сінергетычнай мадэлі ўстойлівасць і раўнавага разглядаюцца ў якасці тупікоў эвалюцыі. Сама ж гістарычная эвалюцыя "характеризуется переходом от одной относительно устойчивой системы к другой системе с новой уровневой организацией элементов и саморегуляцией" [8, с. 183]. Гэта значыць менавіта няўстойлівасць азначае развіццё, якое адбываецца праз выпадковае ўздзеянне на сістэму ў кропцы біфуркацыі.

Рэвалюцыя з'яўляецца адным з такіх момантаў няўстойлівасці. У стане рэвалюцыі грамадства пераходзіць у стадыю актыўнасці, абвастраюцца сацыяльныя канфлікты. Тысячы людзей, галоўным чынам з ліку бяднейшых пластоў насельніцтва, што найбольш пацярпелі ад функцыянавання старой сістэмы, імкнуцца заявіць і паказаць сябе, у першую чаргу, у палітычнай дзейнасці. Але ў такім стане калектыўнага ўзрушання нібы зусім адключанай аказваецца здольнасць кожнай асобы да лагічнага мыслення. Чалавек ў аналагічных абставінах становіцца залежным ад нейкага параметру парадку, які часта знаходзіць адлюстраванне ў стыхійна ўзнікшым лозунгу [7, с. 34]. Прыкладам можа служыць сітуацыя ў Расіі восенню 1917 г., калі высунутыя бальшавікамі папулярныя лозунгі: "Мір – народам!", "Зямля – сялянам!", "Фабрыкі –

рабочым!” сталі сілай, што садзейнічала поспеху бальшавікоў [6, с. 552].

Адным з важнейшых цэнтраў барацьбы за ўладу ў Беларусі і на Заходнім фронце падчас кастрычніцкіх падзей 1917 г. быў Мінск. Выканкам Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у якім пераважалі бальшавікі, 25 кастрычніка 1917 г. выдаў загад № 1 “Да насельніцтва Мінска і яго наваколляў”, дзе казалася аб пераходзе ўлады Саветам. 26 кастрычніка бальшавікі Мінска стварылі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (далей – ВРК) Заходняга фронта [6, с. 553]. І хаця выканкам Мінскага Савета звярнуўся 26 кастрычніка да ўсіх рэвалюцыйных арганізацый краю з прапановай пачаць фарміраванне часовых органаў улады на месцах, фактычна ён праводзіў бальшавіцкую ізаляцыяніскую лінію, абапіраючыся на ВРК Заходняга фронта. Былі праігнараваны патрабаванні шэрагу Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў аб стварэнні дэмакратычнага ўрада. Адбылося сутыкненне з Камітэтам выратавання рэвалюцыі, прадстаўляўшым партыі эсэраў, меншавікоў і бундаўцаў. Назіралася канцэнтрацыя сіл бальшавікоў (26 лістапада 1917 г. быў створаны Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронта [6, с. 554]), а не збліжэнне з сацыялістычнымі партыямі. На думку даследчыкаў, вялікую ролю ў гэтым адыграла асоба К.І. Ландара, які займаў пасады старшыні Мінскага Савета, ВРК Заходняга фронта, Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронта. Яго пазіцыя паслужыла той флуктуацыяй, якая выклікала буйныя наступствы. Супярэчнасці толькі ўзраслі пасля роспуску І Усебеларускага з’езда ў Мінску і Устаноўчага сходу ў Петраградзе [7, с. 35]. Аднак, з пункта гледжання сінергетыкі, адсутнасць К.І. Ландара ў Мінску восенню 1917 г. магла выклікаць да жыцця іншае развіццё падзей, па сутнасці стварыць новую гісторыю. З гэтай роллю асобы звязаны выбар альтэрнатыў.

Такім чынам, сінергетычны падыход да аналіза гістарычна развіваючыхся сістэм сведчыць аб магчымасці існавання для падобных складаных сістэм некалькіх альтэрнатыўных шляхоў развіцця. Увага чалавека да гісторыі

амаль заўсёды мае пад сабой яўны ці скрыты пошук заканамернасцей і інварыянтаў. Асабліва ў пераломныя моманты, паколькі абвостраны пошук на пераломах эпох заўсёды звязаны з ацэнкай альтэрнатыўных шляхоў далейшага развіцця. Пры гэтым кожная альтэрнатыва правяраецца на трываласць, у тым ліку з дапамогай рэтраспекцыі, праз зварот да гісторыі, калі мы ўзнаўляем логіку развіцця ідэй, што вядуць да шукаемага выніку. У дадзеным кантэксце праблематыка новых метадалагчных напрацовак у рамках сенергетычнай парадыгмы ператвараецца ў адзін з перспектыўных накірункаў даследавання.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мінск: БелЭН, 1997. –Т. 4. Кадэты – Ляшчэня. – С. 139 – 141.

2. Красин, Ю.А. Революция социальная/ Ю.А. Красин// Большая Советская Энциклопедия: в 30 т. 3-е изд. – М.: Изд-во “Советская энциклопедия”, 1975. – Т.21: Проба – Ременсы. – С. 545 – 546.

3. Ожегов, С.И. Словарь русского языка: Ок. 57 000 слов/ С.И. Ожегов. – 18-е изд., стереотип. – М.: Рус. яз., 1987. – 797 с.

4. Революция // Политология: Энциклопедический словарь/ Общ. ред. и сост: Ю.И. Аверьянов. – М.: Изд-во Моск. коммерч. ун-та, 1993. – С. 338 – 340.

5. Рудовіч, С.С. Беларусь у перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г./ С.С. Рудовіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Мінск: БелЭн, 2004. – Т. 18. Кн. 2: Рэспубліка Беларусь. – С. 199 – 204.

6. Рудович, С.С. Октябрьская революция 1917/ С.С. Рудович/ Республика Беларусь.: Энциклопедия: В 6 т. Минск: БелЭн, 2007. – Т. 5. – С. 552 – 554.

7. Сидорцов, В.Н. Методология истории: Курс лекций/ В.Н. Сидорцов. – Минск, БГУ, 2010. – 207 с.

8. Степин, В.С. Философская антропология и философия науки/ В.С. Степин. – М.: Высшая школа, 1992. – 191 с.

9. Сцяпанаў, В.І. Рэвалюцыя сацыяльная/ В.І. Сцяпанаў, Ю.А. Гусеў// Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: У 12 т. –

Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1973. – Т. 9: Рабкор – Сочы. – С. 234 – 235.